**МЕНСК. Дом комасветы**

# ДЗЕННІК УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ МАЙСТРАЎ КАЛГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

## *Заключнае паседжанне*

### Выступленні т. т. Гікало, Чэрвякова і Ратнека

* 2-га красавіка ў памяшканні Дома комасветы распачала сваю работу **ўсебеларуская вытворчая нарада брыгадзіраў паляводчых і трактарных брыгад БССР.** На нарадзе прысутнічаюць **400** дэлегатаў, сярод іх каля 50 чал. комсамольцаў і маладых калгаснікаў.

* Пасля ўступнай прамовы тав. **Чарвякова** пад бурныя воплескі ўсёй залы абіраецца прэзідыум у колькасці 36 чалавек, у тым ліку т.т. **Гікапо, Галадзед, Чарвякоў, Картукоў, Саак'ян, Ратнек, Бенэк, Убарэвіч, Смірноў, Закоўскі, Кавальчук, Августайціс, Чэрнушэвіч, Рыскін Горын, Брагінскі, Сакольчык** (брыгадзір Менскага раёна), **Мерутнікава** (Барысаўскі раён), **Шчытаў** (Віцебскі раён), **Хвелепскі** (Аршанскі раён), **Беленкі** (Магілёўскі раён), **Пауленка** (Гомельскі раён), **Захарэнка** (Мозырскі раён), **Цыбульскі** (Белынічы), **Паўлаў** (Шклоўскі раён) і дэлегацыя брыгадзіраў вытворчай нарады Заходняй вобласці.

* Пад гучныя воплескі абіраецца ганаровы прэзідыум у складзе палітбюро ЦК ВКП(б) і бюро ЦК КП(б)Б.

* **Ганаровым старшынёй нарады** пад бурныя воплескі абіраецца т. **Сталін,** якому нарада паслала прывітальную тэлеграму.

* Пасля абрання ганаровага прэзідыума пачалася дзелавая работа нарады. З кароткімі інфармацыямі аб гатоўнасці калгасных і трактарных брыгад выступілі брыгадзіры **Слуцкага, Рагачоўскага** і іншых раёнаў. Яны ў сваіх кароткіх і насычаных яркімі фактамі выступленнях дзеляцца сваім вопытам, а таксама гавораць аб тых недахопах, якія ёсць у падрыхтоўцы і пачатку вясенняй сяўбы.

* Раніішняе паседжанне **3-га** красавіка пачалося выступленнем народнага камісара земляробства БССР тав. **Бенэка**, які надзвычайна коратка і канкрэтна застанавіўся на задачах брыгадзіраў у правядзенні палявых работ, падняцці ўраджайнасці і ўздыму жывёлагадоўлі. Прамова т. Бенэка была выслухана з надзвычайнай увагай. За т. Бенэкам выступаў брыгадзір паляводчай брыгады № 6 калгаса «Шлях Леніна», Чырвонаслабодскага раёна, т. **Бань.**

Апошні дзеліўся вопытам арганізацыі працы ў сваёй брыгадзе і аб уздыме ўраджайнасці. Так, напрыклад, у 1933 г. брыгада Баня атрымала з гектара 11 цэнтнераў жыта (сярэдняя па калгасу 5), пшаніцы — 13 цэнтн. (сярэдняя па калгасу 9), аўса — 13 (сярэдняя па калгасу 12), ячменю 15 (сярэдняя па калгасу 14), бульбы — 110 (сярэдняя па калгасу 105). У гэтым годзе брыгада Баня мяркуе ўзняць з гектара наступную ўраджайнасць: па жыту 12 цэнт., пшаніцы 14, аўсу — 15, ячменю — 15 і бульбе 135 цэнтн.

* На раніішнім паседжанні выступілі з прамовамі прэзідэнт акадэміі Навук тав. **Горын**, загадчык сельскагаспадарчым аддзелам ЦК КП(б)Б тав. **Картукоў** і старшыня ўрадавай камісіі па вызначэнню ўраджайнасці тав. **Нізаўцоў.**

* На вячэрнім паседжанні 3 сакавіка працягваліся выступленні дэлегатаў. Прамовы насілі выключна дзелавы характар, былі прасякнуты наскрозь багатым, канкрэтным зместам, адным жаданнем як найлепш і ў самыя сціслыя тэрміны, высокаякасна правесці веснавую сяўбу 1934 года.

---

* У спрэчках выступалі брыгадзіры паляводчых і трактарных брыгад т. т. **БАБКЕВІЧ** (Лагойскі раён), **БАРОЎСКІ** (Ветрынская МТС, Полацкага раёна), **ВАЛОДЗЬКА** (Менскі раён), **ШПІТАЛЬНІК** (Хойніцкі раён) і іншыя.

У спрэчках таксама выступіў праф. ДАРОЖКІН, які сканцэнтраваў сваё выступленне на пытаннях уздыму ўраджайнасці і ў прыватнасці бульбы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ